# АСАБЛІВАСЦІ ЎЗАЕМААДНОСІН СЯМ'І І ДЗЯРЖАВЫ: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫ АСПЕКТ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСІ)

**І. І. Сямашка**
*аспирант кафедры международного экономического права*
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле выяўлены асаблівасці ўзаемаадносін паміж дзяржавай і сям'ёй на прыкладзе Беларусі. Разгледжаны перыяды развіцця беларускай дзяржаўнасці і прававой сферы з моманту ўтварэння старажытных дзяржаў-княстваў да ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Дзяржава заўсёды імкнулася да стварэння трывалых сямей.

В статье выделены особенности взаимоотношений государства и семьи на примере Беларуси. Рассмотрены периоды развития белорусской государственности и правовой сферы с момента образования древних государств-княжеств до включения белорусских земель в состав Российской империи. Государство всегда стремилось к образованию прочных семей.

The article highlights the features of the relationship between the state and the family on the example of Belarus. The periods of the Belarusian statehood and the legal sphere development from the moment of formation of the ancient States-principalities before including the Belarusian lands in the structure of the Russian Empire are considered. The state has always sought to form strong families.

У Рэспубліцы Беларусь актуальнымі з'яўляюцца пытанні ўмацавання сям'і як важнага сацыяльнага інстытута. На 2019 г. запланавана распрацоўка Канцэптуальных асноў сямейнай палітыкі і прыярытэтных напрамкаў яе шматузроўневай рэалізацыі (навуковае даследаванне). Для вызначэння перспектыў развіцця ўзаемаадносін паміж дзяржавай і сям'ёй актуальным з'ўляецца выяўленне іх асаблівасцей у гісторыі Беларусі на «падставе пераемнасці станоўчага вопыту» [5, с. 11].

Прафесар Т. І.Доўнар вылучае ў развіцці беларускай дзяржаўнасці і прававой сферы наступныя этапы (да 1917 г.): перыяд існавання старажытных беларускіх дзяржаў-княстваў; перыяд ВКЛ; перыяд Рэчы Паспалітай; перыяд знаходжання ў складзе Расійскай імперыі [5, с. 21]. Разгледзім ўзаемаадносіны дзяржавы і сям'і ў гэтыя часы праз аналіз духоўных традыцый (праваслаўнай, каталіцкай і ўніяцкай) [9] і крыніц права.

Першы перыяд развіцця беларускай дзяржаўнасці характарызуецца наяўнасцю звычаёвага права. Прафесар Я. А. Юхо вызначае наступныя рысы сямейнага права ў старажытнасці. Галоўнае значэнне надавалася шлюбу. Для яго сапраўднасці ў дахрысціянскі

перыяд дастаткова было згоды бацькоў на шлюб і ўчыненне вяселля. Асабістыя адносіны мужа і жонкі будаваліся на падпарадкаванні жонкі мужу. Ён прызнаваўся галавой сям'і, але калі муж ішоў у сям'ю жонкі – «у прымы», то ўласнікам гаспадаркі лічылася жонка або яе бацькі. Жанчыны карысталіся значнымі правамі і павагай. За злачынствы супраць жанчыны вінаваты нёс пакаранне ў двайным памеры. Строга караліся злачынствы супраць маральнасці. Па дагавору 1229 г. пралюбадзейства каралася, як і забойства, у памеры 10 грыўнаў (арт. 11). Асноўнай формай сям'і ў язычніцкі перыяд сярод простага народа была парная сям'я, сярод пануючага класа было распаўсюджана і мнагажонства [17, с. 91, 92].

Пасля распаўсюджвання сярод усходніх славян хрысціянства[1] сямейныя адносіны пачынаюць рэгулявацца царквой, якая ў сваіх пастановах абапіралася як на нормы візантыйскага права, так і прымала да ўвагі нормы звычаёвага права. У выніку з'явіліся царкоўна-свецкія крыніцы права. «Так, складзены ў перыяд праўлення кіеўскага князя Яраслава (1019–1054) "Статут Яраслава" – у большасці збор нормаў сямейна-шлюбнага права з яго 6 рэдакцыямі і больш чым 90 спісамі – быў вядомы і ў Беларусі» [5, с. 55]. Згодна царкоўнымі нормамі сапраўдным прызнаваўся шлюб, асвечаны царквой у сакрамэнце вянчання.

К. Бястужаў-Румін, падкрэсліваючы значнасць уздеяння хрысціянства на сямейныя адносіны, адзначаў, што царква ўнесла ў іх маральны пачатак, да гэтага складаўшыя справу вынікова асабістую, яна стварыла трыбунал для суджэння спраў сямейных; ачысціла сям'ю, паставіўшы пачатак адзінажонству, якое змяніла мнагажонства [1, с. 134]. Беларускія навукоўцы І. М. Кузняцоў і В. А. Шаўкапляс разглядвалі праваслаўе як ідэалагічную аснову існуючай у IX – XII стст. улады: «Царква і духавенства актыўна ўдзельнічалі ў палітычным жыцці дзяржавы і грамадства, сканцэнтраваўшы ў сваіх руках пытанні адукацыі, шлюбу, сям'і, апекі і маралі» [8, с. 12].

Такім чынам, у перыяд існавання старажытных беларускіх дзяржаў-княстваў (IX–канец XII стст.) сямейныя адносіны рэгулююцца спачатку звычаёвым правам, а пасля распаўсюджвання хрысціянства, якое з'явілася іх маральнай асновай, – таксама царкоўнымі нормамі.

У ВКЛ, якое «пачало складвацца ў канцы XII ст.» [17, 2000, с. 94], па-ранейшаму сямейныя адносіны рэгуляваліся царкоўнымі ўставамі, у тым ліку «Статутам Яраслава». «У XV – пачатку XVI стст. на Беларусі ўзнікла яго асобная рэдакцыя (т. зв. "Скрутак Яраслава"), дзеянне якога … пацвердзіў Аляксандр у 1502 г. па просьбе полацкага і луцкага

[1] Гэта пачалося, як сведчаць летапісы, у сярэдзіне IX ст. [2, с. 12].

епіскапа Лукі» [5, с. 128]. Але, як адзначае Г. Дзербіна, практыка сведчыць, што, нягледзячы на такую магутную інстытуцыю сярэднявечнага грамадства, як царква, яе імкненне ўсталяваць прыярытэт над інстытуцыяй шлюбу, старадаўныя традыцыі і звычаі змаглі процістаяць царкоўнаму ўплыву да сярэдзіны XVI ст. [4, с. 123].

Царкоўная форма шлюбу была ўзаконена Статутам 1529 г. У адпаведнасці з арт. 12 незаконнымі лічыліся дзеці, нарожданыя ад нявенчанай жонкі, а таксама ў выпадку адмовы бацькі ад бацькоўства (р. III) [14]. На думку Г. Дзербінай, на змест шлюбна-сямейнага права ў гэты перыяд паўплывалі як унутраныя заканамернасці эвалюцыі сістэмы права, так і «новыя ідэалагічныя, эканамічныя, палітычныя з'явы, што апісаныя як феномен эпохі Рэнесансу… Ф. Скарына, М. Літвін, А. Волан (Валян) і іншыя, разглядаючы праблемы шлюбу і сям'і, падкрэслівалі сацыяльную значнасць сям'і як асноўнага элемента грамадства, узаемасувязь трываласці сям'і і стабільнасці дзяржавы» [4, с. 157–158].

Паколькі Статут 1588 г. [15] «пераўзыходзіў папярэднія законы шырынёй прававой рэгламентацыі грамадскіх адносін» [5, с. 185], разгледзім асаблівасці рэгулявання ім сямейных адносін.

У Статуце 1588 г. досыць грунтоўна рэгламентаваны ў першую чаргу маёмасныя, у тым ліку спадчынныя, адносіны паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі, іншымі сваякамі. «Маёмасныя дачыненні, якія вынікалі са шлюбна-сямейных стасункаў, у адрозненні ад уласна шлюбных, дзяржава заўсёды імкнулася пакінуць пад юрысдыкцыяй свецкай улады» [4, с. 76]. Характарызуючы сацыяльна-эканамічныя ўмовы тагачаснай сям'і, у тым ліку і шляхецкай, Г. Дзербіна адзначае, што «матэрыяльныя інтарэсы наўпрост уплывалі на шлюбна-сямейную інстытуцыю: чым багацейшая сям'я, тым больш значныя гэтыя інтарэсы». На думку даследчыцы, «светапогляд дзяцей (дачок) фармаваўся ў сям'і пад уздзеяннем найперш паводзін бацькоў. Дочкі, а затым маці, валодаючы паўнінёю не толькі атрыманых у спадчыну, але і іншых законных правоў у сям'і, адчувалі сябе зусім незалежнымі ад дзяржаўнай улады, а затым і ад уплыву асяроддзя» [4, с. 34, 40].

Асаблівая ўвага надавалася інстытуту апекі, устанаўленне якой мела мэтай, акрамя захавання маёмасці дзяцей, забеспячэнне іх выхавання (р. I, арт. 4).

Бацькоўскія праваадносіны характарызаваліся залежнасцю маёмаснага становішча дзяцей ад волі бацькоў. Па-першае, дачка магла быць пазбаўлена пасагу і спадчыны ў выпадку замужжа без згоды бацькоў (р. V, арт. 8). Па-другое, дзеці пазбаўляліся спадчыны пры адрачэнні ад іх бацькоў (р. VIII, арт. 7). Як адзначае прафесар А. Ф. Вішнеўскі, маёмасныя правы дзяцей пры жыцці бацькоў былі

абмежаваныя. «Бацькі маглі по сваёй волі выдзяліць дзецям частку маёмасці, але дзеці самі не маглі прымусіць бацькоў зрабіць гэта» [3, с. 100]. Спадкаемцамі маглі быць толькі дзеці, народжаныя ў шлюбе, заключаным у царкоўнай форме (р. ІІІ, арт. 28).

Устанаўленне крымінальнай адказнасці за чужаложства і зводніцтва (р. XIV, арт. 30. 31) таксама сведчыла аб зацікаўленасці дзяржавы ў захаванні паміж мужам і жонкай беззаганных адносін. Безумоўна, што ў названых свецкіх нормах знайшлі адлюстраванне нормы царкоўнага права, што не было выпадковым. «У перыяд феадалізму ў Беларусі органы дзяржаўнага кіравання заўсёды былі цесна звязаны з царкоўнай адміністрацыяй і духавенствам. На ўнутраннае жыццё Вялікага Княства Літоўскага значны ўплыў аказвала як праваслаўнае, так і каталіцкае духавенства», – піша Т. І. Доўнар. Роля апашняга ў дзяржаве ўвесь час павялічвалася. У сярэдзіне XVI ст. міжканфесійныя адносіны значна абвастрыліся [5, с. 123]. Пасля заключэння ў кастрычніку 1596 г. Брэсцкай царкоўнай уніі была створана ўніяцкая (грэка-каталіцкая) царква. «У XVIII ст. на беларускіх землях уніяцтва стала масавай рэлігійнай плынню (па сведчаннях навукоўцаў, 70–75 % сялян у канцы XVIII ст. з’яўляліся ўніятамі)» [5, с. 126].

Працягваючы аналіз Статута 1588 г., адзначым, што ў р. XI «Аб гвалтах, пабоях, галоўшчынах шляхецкіх» змешчаны нормы, якія прадугледжвалі крымінальную адказнасць за забойства жонкі або мужа аднаго другім, маці ці бацькі дачкой ці сынам, свайго дзіцяці бацькамі, а таксама брата ці сястры аднаго другім (арт. 6–8).

У 1569 г. ВКЛ разам з Польшчаю аб’ядналіся ў адну дзяржаву – Рэч Паспалітую. Але Статут 1588 г. «юрыдычна замацаваў захаванне суверэнітэту дзяржавы» [5, с. 227]. Ён заставаўся «галоўнай крыніцай права на Беларусі і ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім у складзе Рэчы Паспалітай» [17, с. 304]. Асаблівых змен у прававвой рэгламентацыі сямейных адносін у гэты перыяд не адбывалася. У другой палове XVIII ст. «пачынаюцца больш актыўныя спробы дзяржаўнага рэфармавання, у тым ліку ў кірунку стварэння агульных для ўсёй дзяржавы цэнтральных выканаўча-распарадчых органаў… Значным радыкальным крокам у галіне асветы стала школьная рэформа, ажыццёўленая пад кіраўніцтвам Адукацыйнай камісіі…» [5, с. 239, 241]. Рэч Паспалітая была ліквідавана ў выпадку яе трох падзелаў, адбыўшыхся ў канцы XVIII ст.

Такім чынам, у ВКЛ у перыяд XIII–XVI стст. органы дзяржаўнага кіравання былі цесна звязаны з царкоўнай адміністрацяй, а таксама праваслаўнаўным і каталіцкім духавенствам, якое аказвала значны ўплыў на ўнутраныя справы дзяржавы. Сямейныя адносіны рэгуляваліся

статутамі і *1588 г.,* царкоўнымі ўставамі, аднак да канца XVI ст. дзейнічалі нормы старажытнага звычаёвага права. Праз усталяванне царкоўнай формы заключэння шлюбу дзяржава была зацікаўлена ў законным сумесным жыцці мужчыны і жанчыны, а таксама захаванні паміж імі беззаганных адносін. Аснову сямейных правaадносін складалі маёмасныя інтарэсы, што дазваляла сям'і быць незалежнай ад дзяржавы, з аднаго боку, а бацькам мець уладу над дзецьмі, з другога боку. Прадугледжвалася крымінальная адказнасць за забойства сваякоў [13]. Сям'я паступова ператварылася ў асноўны элемент грамадства. У перыяд знаходжання ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, калі была створана ўніяцкая царква, і ўніяцтва стала масавай рэлігійнай плынню, асаблівых змен у сямейных адносінах не наглядаецца.

Характарызуючы перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.), у першую чаргу трэба адзначыць, что свецкай вярхоўнай уладзе падпарадкоўваўся царкоўны ўрад – Свяцейшы Сінод. Па гэтай прычыне нормы царкоўнага права яшчэ больш укараніліся ў свецкае заканадаўства: указы імператараў, Звод законаў Расійскай імперыі. Мы падзяляем меркаванне У. М. Сатоліна аб тым, што адной з характэрных асаблівасцяў рэгламентавання шлюбна-сямейных адносін у гэты перыяд было больш цеснае, чым у краінах Заходняй Еўропы, змыканне юрыдычных нормаў і кананічных прадпісанняў [12, с. 9]. Акрамя таго, на беларускіх землях «яўна пачала праяўляцца актыўная дзейнасць царскага ўраду па ліквідацыі ўніяцкай царквы і пераводу насельніцтва ў праваслаўе» [5, с. 126], якое было пануючай рэлігіяй у Расійскай імперыі.

Асноўнай крыніцай права, якая рэгулявала сямейныя адносіны ў гэты перыяд, быў Звод законаў Грамадзянскіх (кніга І «Аб правах і абавязках сямейнасці»), уключаны ў том Х Звода Законаў Расійскай імперыі [7]. Асобы праваслаўнага веравызнання павінны былі заключаць шлюб у храмах па правілах Праваслаўнай Царквы, асобы іншых хрысціянскіх веравызнанняў – па правілах адпаведных цэркваў. Дазвалялася ўступаць у шлюб паміж сабою асобам нехрысціянскага веравызнання па ўстаноўленым імі правілам і звычаям, гэта значыць без удзелу свецкай улады ці Хрысціянскага духоўнага ўрада. Асноўным доказам заключэння шлюбу з'яўляліся прыхадскія (метрычныя) кнігі і ведамасці, парадак вядзення якіх вызначаўся кнігай ІІ «Аб актах станаў» р. І «Аб агульных актах станаў» тома ІХ Звода законаў Расійскай імперыі [6]. У іх запісваліся таксама такія акты грамадзянскага стану, як нараджэнне і смерць. Метрычныя пасведчанні, уяўляўшыя сабой выпіскі з названных кніг і ведамасцей, выдаваліся ў кансісторыях (арт. 1574) [6]. У 1874 г. для раскольнікаў была прадугледжана грамадзянская

форма заключэння шлюбу, уяўляўшая сабой унясенне запісу ў асобную метрычную кнігу, якая вялася паліцыяй.

У заканадаўстве замацоўваліся наступныя асабістыя абавязкі мужа і жонкі: муж павінен любіць жонку як сваё цела, жыць з ёй у згодзе, паважаць, абараняць, прабачыць яе недахопы і палягчаць яе немачы, забяспечваць ёй наедак і ўтрыманне па стану і магчымасці сваёй (арт. 106). Жонка павінна падпарадкоўвацца мужу як кіраўніку сямейства, знаходзіцца ў любові да яго, павазе і ў неабмежаваным паслухмянстве, аказваць яму лагоды і прыхільнасць як гаспадыня дому (арт. 107). Аднак, калі асабістыя праваадносіны рэгламентаваліся дэталёва, то маёмасным надавалася менш увагі: шлюбам не стваралася агульнае валоданне ў маёмасці мужа і жонкі; кожны з іх мог мець і зноў набываць асобную ўласнасць (арт. 109) [7].

У Расійскай імперыі, як і ў ВКЛ, бацькоўская ўлада была амаль неабмежаванай. Яна распаўсюджвалася на дзяцей незалежна ад полу і ўзросту, з адрозненнямі і ў межах, устаноўленых законам. У Расіі для выпраўлення свавольных і непаслухмяных дзяцей бацькі маглі ўжываць хатнія папраўчыя меры, аддаваць ва ўціхамірвальныя дамы (напрыклад, за распуснае жыццё) (артарт. 164–171). Скаргі на дзяцей можна было падать ў «совестный» суд. У той жа час бацькі абавязаны былі даваць непаўналетнім дзецям пражытак, адзенне, выхванне, звяртаць увагу на іх маральную адукацыю (артарт. 172–173). Дзеці, у сваю чаргу, павінны аказваць бацькам пашану, паслухмянасць, пакорлівасць, любоў, адклікацца аб іх с павагай, зносіць бацькоўскія павучанні цярпліва і без ропата. Павага да бацькоў павінна была працягвацца і пасля іх смерці (арт. 177)[2] [7].

Асаблівай увагі заслугоўвае прававое становішча дзяцей, народжанных па-за шлюбам, да якіх нецярпіма адносіліся «дзяржава і царква, умешваючыся ў сферу адносін мужчыны і жанчыны » [12, с. 12]. Так, незаконнымі лічыліся дзеці, якія нарадзіліся, у прыватнасці, па-першае, па-за шлюбу (нават калі б іх бацькі пазней пажаніліся), па-другое, ад пралюбадзейства, па-трэцяе, у шлюбе, прызнаным незаконным і несапраўдным (арт. 132). Законам ад 12 сакавіка 1891 г. «Аб дзецях узаконеных і ўсыноўленых» (арт. 7525) [10] з ліку незаконных выключалася першая катэгорыя дзецей, пры ўмове, што іх бацькі ўступілі ў шлюб і ўзаконілі іх ва ўстаноўленым парадку. Па-ранейшаму незаконнымі лічыліся дзеці, народжаныя ад пралюбадзейства. Аднак змешчаны ў кнізе талкаванняў Сената да вышэйназванага закона ўзор прашэння аб узаконенні дзіцяці, народжанага ад пралюбадзейства, [16, с. 91], сведчыць аб тым, што ў

[2] *На жаль, гэтая норма не прадугледжана айчынным заканадаўствам.*

асобных выпадках гэта дазвалялася рабіць выключна па міласці імператара. У выніку Законам ад 3 чэрвеня 1902 года «Аб зацвярджэнні правіл аб паляпшэнні становішча незаконнанароджанных дзяцей» (арт. 21566) [11] дзеці, народжаныя ў несапраўдным шлюбе, пачалі прызнавацца законнымі, народжаныя ад пралюбадзейства маглі быць узаконены шлюбам бацькоў.

Такім чынам, пасля далучэння да Расійскай імперыі беларускіх зямель на іх тэрыторыі дзейнічала расійскае заканадаўства, якое будавалася на нормах царкоўнага права. Пануючай рэлігіяй было праваслаўе, свецкай вярхоўнай уладзе падпарадкоўваўся царкоўны ўрад. Асобы праваслаўнага веравызнання павінны былі заключаць шлюб толькі ў царкоўнай форме. Акты грамадзянскага стану (шлюбы, нараджэнні, смерці) запісваліся ў прыхадскія (метрычныя) кнігі і ведамасці. Грамадзянскім заканадаўствам дэталева вызначаліся асабістыя абавязкі мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей, сцвярджалася бацькоўская ўлада (якая была амаль неабмежаванай). Дзяржава пастаянна імкнулася падтрымліваць «въ общественном сознаніі высокое значеніе брака» [15, с. 9]. Па гэтай прычыне вельмі доўга прызнаваліся незаконнымі дзеці, народжаныя па-за шлюбу, а асобныя пытанні па іх узаконенню вырашаліся выключна імператарам.

Вышэйпададзеннае дазваляе зрабіць наступныя вывады.

1. У перыяд існавання старажытных беларускіх дзяржаў-княстваў (IX– канец XII стст.) сямейныя адносіны рэгулююцца спачатку звычаёвым правам, а пасля распаўсюджвання хрысціянства, –у асноўным царкоўнымі нормамі.

2. У ВКЛ (перыяд XIII–XVI стст.) сямейныя адносіны рэгуляваліся свецкім заканадаўствам, царкоўнымі ўставамі, нормами звычаёвага права. Свецкім заканадаўствам шмат увагі надавалася маёмасным адносінам паміж сваякамі. Органы дзяржаўнага кіравання былі цесна звязаны з царкоўнай адміністрацыяй, а таксама праваслаўным і каталіцкім духавенствам.

У Рэчы Паспалітай (канец XVI–канец XVIII стст.) уніяцтва стала масавай рэлігійнай плынню ў XVIII ст., аднак сямейныя адносіны амаль не змяніліся.

3. У перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст.–1917 г.) на іх тэрыторыі дзейнічала расійскае заканадаўства, якое будавалася на нормах царкоўнага права. Пануючай рэлігіяй было праваслаўе. Грамадзянскім заканадаўствам дэталева вызначаліся асабістыя абавязкі мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей (бацькі павінны ўсю сваю ўвагу звяртаць на маральную адукацыю дзяцей, дзеці – аказваць ім пашану, паслухмянасць), сцвярджалася бацькоўская ўлада.

Акты грамадзянскага стану (шлюбы, нараджэнні, смерці) запісваліся ў прыхадскія (метрычныя) кнігі і ведамасці. Асобныя пытанні па ўзаконенню дзяцей вырашаліся выключна імператарам.

Такім чынам, на працягу ўсяго перыяда развіцця беларускай дзяржаўнасці і правовой сферы (IX ст.–1917 г.) сямейныя адносіны былі аб’ектам прававога рэгулявання: спачатку – нормамі звычаёвага права, пасля распаўсюджвання хрысціянства – нормамі царкоўнага права, затым – нормамі свецкага права. Пры гэтым хрысціянства было іх маральнай асновай. Дзяржава паступова пераходзіла ад дэталёвага рэгулявання заканадаўствам маёмасных адносін сваякоў да асабістых. Разглядаючы сям’ю як асноўны элемент грамадства, яна заўсёды была зацікаўлена ў яе трываласці, моцнай бацькоўскай уладзе, захаванні паміж мужам і жонкай беззаганных адносін.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Бястужаў-Румін К. Руская гісторія. СПб.: Тыпаграфія А. Траншеля, 1872. Т. 1. 480 с.
2. Вішнеўская І.У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX–пачатак XXI стст.) : манаграфия. Мінск : Тэсей, 2008. 296 с.
3. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. Мінск : Акадэмія МУС Рэсп. Беларусь, 2003. 319 с.
4. Дзербіна Г. Права і сям’я ў Беларусі эпохі Рэнесансу. Мінск : Тэхналогія, 1997. 175 с.
5. Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. Мінск : ДІКСТ БДУ, 2011. 552 с.
6. Звод законаў Расійскай Імперыі : У 15-х т. СПб. : Тыпаграфія Другога аддзялення Уласнай Я. І. В. Канцэлярыі, 1857–1868. Т. IX. Законы аб станах. 1857 г.
7. Звод законаў Расійскай Імперыі : У 15-х т. СПб. : Тыпаграфія Другога аддзялення Уласнай Я. І. В. Канцэлярыі, 1857–1868. Т. X. Ч. 1. Законы грамадзянскія. 1857 г.
8. Кузняцоў І.М. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / І. М. Кузняцоў, В.А. Шаўкапляс. Мінск : Дікта, 1999. 272 с.
9. Паўлаў В.І. Метадалагічныя асаблівасці асэнсавання айчыннай дзяржаўна-правовой традыціі на пуцях будавання сучаснай мадэлі беларускай дзяржавы // Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года – падмурак развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыяналізму (да 480-годдзя прыняцця) : зб. навук. арт. Мінск : РІВШ, 2009. С. 38–44.
10. Поўны Збор Законаў Расійскай Імперыі : Збор трэці : У 33-х т. – СПб. : Дзярж. Тыпаграфія, 1885–1916. Т. XI. 1891 г. 1894.
11. Поўны Збор Законаў Расійскай Імперыі : Збор трэці : У 33-х т. – СПб. : Дзярж. Тыпаграфія, 1885–1916. Т. XXII. Аддзяленне 1. 1902 г. 1904.
12. Сатолін У.М. Гісторыя станаўлення і развіцця законадаўства аб шлюбе і сям’і Беларусі: аўтарэф. дыс. … канд. юрыд. навук: 12.00.01. Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 1997. 20 с.

13. Сямашка І.І. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года: асаблівасці рэгулявання сямейных адносін. Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1588 г.: да 430-годдзя выдання : зб. навук. арт. па матэрыялах канф. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С.А. Балашэнка (гал. рэд.) [ і інш.]. Мінск : БДУ, 2018. С. 188–191.

14. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу http://vostlit.narod.ru/Texts/Dokumenty/Litva/XVI/1520-40/Statut1529/text2.htm. Дата доступу : 28.06.2019.

15. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Пер. на бел. мову А. С. Шагун. Мінск : Беларусь, 2002. 207 с.

16. Узаконенне і усынаўленне дзяцей (Закон 12 сакавіка 1891 г.), з заканадаўчымі матывамі, тлумачэннямі Сената і ўзорамі бумаг / склад. : М. Мартынаў. СПб. : Тыпаграфія Мяркушава, 1902. 95 с.

17. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. Мінск : РІВШ БДУ, 2000–2003. Ч. 1. 2000. 352 с.